# АБІТУРЫЕНТУ-82

ПРАЛЕТАРЫІ ЎСІХ КРАІН, ЯДНАЙЦЕСЯ!

# БЕЛАРУСКІ УНІВЕРСІТЭТ

1982
22
КРАСАВІКА
ЧАЦВЕР
№ 15 (1353)
Выходзіць раз у тыдзень

Выдаецца з мая 1922 года

ОРГАН ПАРТКОМА, РЭКТАРАТА, МЯСЦКОМА, КАМІТЭТА КАМСАМОЛА І ПРАФКОМА БЕЛАРУСКАГА ОРДЭНА ПРАЦОЎНАГА ЧЫРВОНАГА СЦЯГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА ІМЯ У. І. ЛЕНІНА

## З Правілаў прыёму ў БДУ імя У. І. Леніна ў 1982 годзе

**БЕЛАРУСКІ ОРДЭНА ПРАЦОЎНАГА ЧЫРВОНАГА СЦЯГА ДЗЯРЖАЎНЫ УНІВЕРСІТЭТ ІМЯ У. І. ЛЕНІНА ПРАВОДЗІЦЬ У 1982/83 НАВУЧАЛЬНЫМ ГОДЗЕ ПРЫЁМ СТУДЭНТАЎ**

**на дзённае навучанне па спецыяльнасцях:**

беларуская і руская мова і літаратура, біялогія, геаграфія, журналістыка, гісторыя, матэматыка (педагагічны і вытворчы патокі), механіка, палітычная эканомія, правазнаўства, прыкладная матэматыка, радыёфізіка і электроніка, руская мова і літаратура, фізіка (педагагічны і вытворчы патокі), філасофія, хімія (педагагічны і вытворчы патокі);

**на вячэрняе навучанне па спецыяльнасцях:**

геаграфія, гісторыя, матэматыка, правазнаўства, прыкладная матэматыка, радыёфізіка і электроніка, руская мова і літаратура, фізіка, хімія;

**на завочнае навучанне па спецыяльнасцях:**

беларуская і руская мова і літаратура, біялогія, геаграфія, журналістыка, гісторыя, правазнаўства, руская мова і літаратура, філасофія.

### І. УМОВЫ ПРЫЁМУ

Ва універсітэт на дзённую форму навучання прымаюцца асобы ва ўзросце да 35 гадоў, а на вячэрнюю і завочную форму — без абмежавання ўзросту.

Асобы, якія паступаюць ва універсітэт на навучанне з адрывам ад вытворчасці ў наступныя гады пасля заканчэння сярэдняй навучальнай установы, як правіла, павінны мець стаж практычнай работы не менш 6 месяцаў за кожны год, калі яны не вучыліся.

Скончыўшыя сярэднія спецыяльныя ўстановы прымаюцца на навучанне з адрывам ад вытворчасці, калі яны маюць трохгадовы стаж практычнай работы пасля заканчэння навучальнай установы. Указаны стаж не патрабуецца ад выпускнікоў сярэдніх спецыяльных навучальных устаноў, калі яны атрымалі дыплом з адзнакай і ўключаны ў лік кандыдатаў для паступлення ў вышэйшыя навучальныя ўстановы, а таксама ад выпускнікоў гэтых жа навучальных устаноў, якія маюць выдатныя і добрыя адзнакі па ўсіх прадметах і абаранілі дыпломныя праекты ці здалі дзяржаўныя экзамены з такімі ж адзнакамі і рэкамендаваны педагагічнымі саветамі для паступлення ў дзённыя ВНУ на адпаведныя спецыяльнасці.

Асновай для прыёму дакументаў ад асоб, якія скончылі сярэднія спецыяльныя навучальныя ўстановы з адрывам ад вытворчасці, з'яўляюцца даведкі ўстаноўленага ўзору (дадатак № 1 і 2 да Правілаў прыёму).

Асобы, якія скончылі прафесійна-тэхнічныя навучальныя ўстановы і маюць сярэднюю адукацыю, прымаюцца на навучанне з адрывам ад вытворчасці пры наяўнасці ў іх стажу практычнай работы не менш двух гадоў пасля заканчэння прафесійна-тэхнічных устаноў.

Асобы, якія скончылі з адзнакай прафесійна-тэхнічныя навучальныя ўстановы, а таксама выпускнікі сярэдніх прафтэхвучылішчаў і тэхнічных вучылішчаў, якія маюць выдатныя і добрыя адзнакі па ўсіх прадметах і паспяхова вытрымалі кваліфікацыйныя экзамены і рэкамендаваны ў лік 10 працэнтаў выпуску педагагічнымі саветамі вучылішчаў для навучання ў дзённыя вышэйшыя навучальныя ўстановы па адпаведнай спецыяльнасці, прымаюцца непасрэдна пасля заканчэння вучылішча пры прадстаўленні даведкі ўстаноўленага ўзору (дадатак № 3 да Правілаў прыёму).

На спецыяльнасці журналістыка, правазнаўства, філасофія, палітычная эканомія, гісторыя прымаюцца на навучанне з адрывам ад вытворчасці, як правіла, асобы, якія маюць стаж практычнай работы не менш двух гадоў і станоўча праявілі сябе ў грамадска-палітычнай рабоце, пры гэтым на спецыяльнасць журналістыка прымаюцца асобы, якія праявілі здольнасці да літаратурнай дзейнасці і паспяхова прайшлі творчы конкурс.



Для ўдзелу ў творчым конкурсе паступаючыя на дзённае аддзяленне (як тыя, хто мае вытворчы стаж, так і школьнікі) павінны прадставіць: творчую характарыстыку-рэкамендацыю, выдадзеную рэдакцыяй газеты, часопіса, радыё, тэлебачання, інфармацыйным агенцтвам ці мясцовым аддзяленнем Саюза журналістаў СССР, а таксама матэрыялы, апублікаваныя ў адкрытым друку ці перададзеныя па радыё, тэлебачанню, і ў якасці дапаўнення —неапублікаваныя матэрыялы, надрукаваныя на машынцы. Апублікаваныя матэрыялы прадстаўляюцца ў выглядзе выразак (фотапублікацыі могуць дубліравацца арыгіналам). Матэрыялы радыё і тэлебачання прадстаўляюцца ў машынапісных рукапісах. Усе публікацыі павінны быць завераны пячаткай адпаведнай рэдакцыі і падпісаны яе кіраўніком. Аўтары работ, якія атрымалі станоўчыя водзывы, допускаюцца да ўдзелу ў творчым конкурсе, які праводзіцца з 15 па 25 ліпеня (па выкліку) у два туры: I — пісьмовая работа, II — субяседаванне. Матэрыялы на конкурс прымаюцца з 1 чэрвеня па 10 ліпеня. Асобы, якія паспяхова прайшлі творчы конкурс, допускаюцца да ўступных экзаменаў. Члены Саюза журналістаў СССР вызваляюцца ад творчага конкурсу і пасля паспяховай здачы ўступных экзаменаў залічваюцца ў састаў студэнтаў па-за конкурсам.

На завочнае навучанне па спецыяльнасці біялогія і на вячэрняе — па спецыяльнасці прыкладная матэматыка прымаюцца толькі асобы, якія маюць адпаведную закончаную сярэднюю спецыяльную адукацыю, а таксама працуюць па гэтых ці блізкіх спецыяльнасцях.

### ІІ. ПАРАДАК ПРЫЁМУ

Заява аб прыёме падаецца на імя рэктара універсітэта па форме. Паступаючыя на спецыяльнасці фізіка, матэматыка, хімія на дзённую форму навучання ўказваюць паток — вытворчы ці педагагічны.

Паступаючыя на завочнае навучанне падаюць заявы аб прыёме ў бліжэйшую да іх месца жыхарства вышэйшую навучальную ўстанову, якая мае спецыяльнасць, што цікавіць іх.

**Да заявы прыкладаюцца:**

1. **Дакумент аб сярэдняй адукацыі** ў арыгінале (атэстат, дыплом з прылажэннем да яго).
2. **Характарыстыка** для паступаючых у ВНУ з апошняга месца работы, датаваная 1982 годам, якую выдаюць партыйныя, камсамольскія, прафсаюзныя і іншыя грамадскія арганізацыі, кіраўнікі прадпрыемстваў, устаноў, арганізацый, праўленні калгасаў. Асобы, якія не маюць двухгадовага стажу практычнай работы, могуць прадстаўляць характарыстыку, выдадзеную кіраўнікамі і грамадскімі арганізацыямі школ і іншых навучальных устаноў, у якіх яны навучаліся. Прадстаўленне характарыстыкі ад камандавання воінскай часці звольненымі ў запас з Узброеных Сіл СССР не абавязкова.
3. **Выпіска з працоўнай кніжкі** (для тых, хто працуе), завераная кіраўнікамі прадпрыемстваў, у якой пасля апошняга запісу ўказваецца, што яе ўладальнік працуе па ўказанай спецыяльнасці ў гэты час.
4. **Медыцынская даведка** (форма 286).
5. 4 фотакарткі размерам 3×4 см (здымкі без галаўнога ўбору).

У сувязі з апрацоўкай статыстычных даных прыёму на ЭВМ паступаючым прапаноўваецца запоўніць анкету «Абітурыент-82», бланк якой выдаецца ці высылаецца (па запыту) прыёмнай камісіяй.

Залічаныя на дзённую форму навучання абавязаны да пачатку навучальнага года прадставіць у арыгінале дакумент, які пацвярджае стаж работы.

Па прыбыцці ва універсітэт паступаючы прад'яўляе асабіста пашпарт, ваенны білет ці прыпіснае пасведчанне.

**Прыём заяў праводзіцца:**

а) на дзённае і вячэрняе навучанне — з 20 чэрвеня па 31 ліпеня;

б) на завочнае навучанне — з 20 красавіка па 31 мая.

**Уступныя экзамены** праводзяцца ў наступныя тэрміны:

а) на дзённае і вячэрняе навучанне — з 1 па 20 жніўня;

б) на завочнае навучанне — з 1 па 20 чэрвеня.

**(Заканчэнне на 4-й стар.).**

## Белдзяржуніверсітэт запрашае на факультэты



# ЖУРНАЛІСТЫКІ

СЁННЯ ў Беларусі, бадай, няма друкаванага органа, камітэта па радыёвяшчанню і тэлебачанню, выдавецтва, дзе б не працавалі выпускнікі нашага факультэта.

На факультэце журналістыкі вучыцца нялёгка, але цікава. За пяць гадоў вучобы будучы журналіст абавязаны глыбока авалодаць марксісцка-ленінскай тэорыяй, вывучыць гістарычны вопыт КПСС і сучасныя метады ідэалагічнай барацьбы, добра ведаць актуальныя праблемы і законы сацыялістычнай эканомікі, навукова-тэхнічнага прагрэсу, навучыцца аналізаваць гаспадарчую дзейнасць прадпрыемстваў, прынцыпы арганізацыі сацыялістычнага спаборніцтва, навучыцца з партыйных пазіцый абагульняць з'явы і факты грамадскага жыцця і даходліва асвятляць іх, набыць навыкі карэспандэнцкай і рэдактарскай работы. Вось чаму на факультэце, акрамя звычайных універсітэцкіх курсаў, вывучаецца і шэраг спецыяльных: тэорыя і практыка савецкай журналістыкі, тэорыя і практыка радыёвяшчання, журналісцкае майстэрства, гісторыя рускай, партыйна-савецкай, замежнай рабочай і камуністычнай журналістыкі, тэхніка афармлення газет, радыё- і тэлеперадач, асновы эканомікі сельскай гаспадаркі і прамысловасці, савецкае права, прыкладная сацыялогія, практычная стылістыка і рэдагаванне. Акрамя таго, выпускнікі факультэта атрымліваюць фундаментальную падрыхтоўку па рускай і беларускай мовах, беларускай і замежнай літаратуры, вывучаюць асновы фотарэпартажу, тэхніку машынапісу, набываюць практычныя навыкі журналісцкай работы не толькі ў час лабараторных і практычных заняткаў, але і ў перыяд вучэбна-азнаямленчай, вытворчай і пераддыпломнай практык.

Паступаючыя на факультэт абавязаны даказаць, што іх выбар не выпадковы. Гэтай мэце служыць творчы конкурс, які праводзіцца ў ліпені ў некалькі этапаў. Спачатку абітурыенты накіроўваюць у прыёмную камісію свае публікацыі, сцэнарыі радыё- і тэлеперадач і, дадаткова, нідзе не апублікаваныя работы, якія ацэньвае спецыяльнае журы з вопытных журналістаў і выкладчыкаў. Тыя, хто прайшоў папярэдні этап, выклікаюцца ва універсітэт, дзе пішуць работу. Яе мэта—выявіць іх журналісцкія здольнасці. З пераможцамі гэтага этапа праводзіцца вуснае субяседаванне, у час якога выяўляецца іх грамадска-палітычная актыўнасць, шырыня інтарэсаў, агульны кругагляд.

Усе паступаючыя абавязаны прадставіць у прыёмную камісію характарыстыкі-рэкамендацыі тых газет, часопісаў, камітэтаў па радыёвяшчанню і тэлебачанню, дзе яны супрацоўнічалі.

**П. ТКАЧОЎ,**
**дэкан факультэта журналістыкі.**



# ХІМІЧНЫ

ХІМІЧНЫ факультэт БДУ вось ужо 50 год з'яўляецца адзінай базай у нашай рэспубліцы па падрыхтоўцы хімікаў з вышэйшай універсітэцкай адукацыяй. Вучэбную і навуковую работу на факультэце вядуць 11 дактароў і звыш 70 кандыдатаў навук. Штогод на першы курс дзённага аддзялення прымаецца 150 студэнтаў, падрыхтоўка якіх з самага пачатку здзяйсняецца асобна на вытворчым і педагагічным патоках па сямі спецыялізацыях: неарганічнай хіміі, аналітычнай хіміі, арганічнай хіміі, фізічнай хіміі, хіміі высокамалекулярных злучэнняў, хіміі паўправаднікоў, радыяцыйнай хіміі.

Падрыхтоўка па спецыялізацыях пачынаецца на чацвёртым курсе. У гэты перыяд навучання ўсе студэнты выконваюць навуковыя даследаванні, якія перарастаюць у дыпломныя работы. Значная частка дыпломных работ выконваецца ў навукова-даследчым інстытуце фізіка-хімічных праблем, створаным нядаўна пры факультэце, у інстытутах АН БССР, на прамысловых прадпрыемствах.

Студэнты педагагічнага патоку разам з піянерскай і педагагічнай практыкамі праходзяць трохтыднёвую вытворчую практыку на хімічных прадпрыемствах. На вытворчым патоку арганізуецца больш працяглая вытворчая практыка на прадпрыемствах і ў навукова-даследчых установах Масквы, Мінска, Харкава, Гомеля, Віцебска, Маладзечна. Выпускнікі педагагічнага патоку атрымліваюць кваліфікацыю «Хімік. Выкладчык» і накіроўваюцца на работу ў асноўным у агульнаадукацыйныя школы. Выпускнікі вытворчага патоку атрымліваюць кваліфікацыю «Хімік» і накіроўваюцца на працу ў навукова-даследчыя ўстановы альбо на прадпрыемствы. Пры гэтым большая частка выпускнікоў накіроўваецца ў электронную, радыётэхнічную, электратэхнічную і часткова ў хімічную прамысловасць.

**В. ЦІКАВЫ,**
**дэкан хімічнага факультэта.**

# ГІСТАРЫЧНЫ



НА ГІСТАРЫЧНЫМ факультэце тры аддзяленні: гісторыі, палітэканоміі, філасофіі. Выпускнік гістфака — гэта спецыяліст з глыбокай ідэйна-тэарэтычнай падрыхтоўкай, шырокім кругаглядам, высокім культурным узроўнем. Разам з тым факультэт дае глыбокія спецыяльныя веды, неабходныя для будучай прафесіі. Кожнае аддзяленне рыхтуе спецыялістаў пэўнага профілю. Аддзяленне гісторыі — спецыялістаў-гісторыкаў: настаўнікаў, выкладчыкаў тэхнікумаў, прафесіянальна-тэхнічных вучылішчаў і ВНУ, навуковых работнікаў.

Выпускнікі аддзялення філасофіі накіроўваюцца на работу ў вышэйшыя навучальныя ўстановы і навукова-даследчыя інстытуты, сацыялагічныя лабараторыі і на буйныя прамысловыя прадпрыемствы (інжынерамі-сацыёлагамі).

Спецыялістаў шырокага профілю рыхтуе аддзяленне палітэканоміі. Яго выпускнікі накіроўваюцца на работу ў ВНУ і тэхнікумы, у навуковыя ўстановы, а таксама на буйныя прадпрыемствы — інжынерамі-эканамістамі.

Спецыялізацыя ў філасофаў ідзе па двух напрамках: дыялектычны і гістарычны матэрыялізм і сацыялогія.

Вучоба на аддзяленні палітэканоміі ўзбройвае веданнем сутнасці вытворчых адносін, заканамернасцей і законаў сацыялістычнага, а таксама капіталістычнага спосабаў вытворчасці. Будучыя эканамісты атрымліваюць салідную матэматычную падрыхтоўку, вывучаюць гісторыю народнай гаспадаркі СССР і замежных краін, эканоміку асобных галін народнай гаспадаркі, бухгалтарскі ўлік, фінансава-крэдытную сістэму і іншыя спецыяльныя эканамічныя дысцыпліны.

Кім бы ні працаваў наш выпускнік, ён заўсёды з'яўляецца актыўным прапагандыстам палітыкі КПСС, грамадскім актывістам, арганізатарам.

**І. ЦАРУК,**
**дэкан гістарычнага факультэта.**



# ЮРЫДЫЧНЫ

ЮРЫДЫЧНЫ ФАКУЛЬТЭТ — асноўны цэнтр Беларусі па падрыхтоўцы кваліфікаваных спецыялістаў па правазнаўству.

Сёння навукова-даследчую і вучэбную работу на юрфаку вядуць 8 дактароў, 42 кандыдаты юрыдычных навук. Вучоныя факультэта прымаюць актыўны ўдзел у падрыхтоўцы многіх важных законаў Беларускай ССР. Да навукова-даследчай работы па падрыхтоўцы праектаў заканадаўчых актаў прыцягваюцца студэнты. У навукова-даследчых гуртках студэнты займаюцца даследаваннямі па выбраных імі тэмах, звязаных з кваліфікацыяй і расследаваннем злачынстваў, разгледжаннем у судах грамадзянскіх, працоўных, жыллёвых, сямейных і іншых спраў. Студэнты маюць магчымасць пад кіраўніцтвам прафесараў і дацэнтаў даследаваць і тэарэтычныя праблемы дзяржавы і права.

На дзённую форму навучання па спецыяльнасці правазнаўства прымаюцца, як правіла, асобы, якія маюць стаж практычнай работы не менш двух гадоў і станоўча праявілі сябе ў грамадска-палітычнай рабоце, а таксама звольненыя ў запас ваеннаслужачыя, якія праслужылі на ваеннай службе не менш двух гадоў.

За час навучання студэнты атрымліваюць фундаментальную падрыхтоўку па грамадскіх дысцыплінах: гісторыі КПСС, палітычнай эканоміі, марксісцка-ленінскай філасофіі і навуковаму камунізму. Яны вывучаюць спецыяльныя дысцыпліны, якія прадугледжаны вучэбным планам па спецыяльнасці правазнаўства: тэорыю дзяржавы і права, гісторыю палітвучэнняў, гісторыю дзяржавы і права СССР, гісторыю дзяржавы і права замежных краін, дзяржаўнае права замежных сацыялістычных краін, дзяржаўнае права капіталістычных краін і краін, якія вызваліліся ад каланіяльнага прыгнёту, савецкае дзяржаўнае права, адміністратыўнае права, крымінальнае, грамадзянскае і іншыя.

Факультэт рыхтуе спецыялістаў па спецыяльнасці правазнаўства шырокага профілю, аднак кожны студэнт спецыялізуецца па адной з наступных спецыялізацый: дзяржаўна-прававо́й, гаспадарча-прававой, судзебна - пракурорскай - следчай.

Дзяржаўна-прававая. Гэта спецыялізацыя дае студэнтам глыбокую падрыхтоўку для работы ў партыйных, камсамольскіх, прафсаюзных і іншых грамадскіх арганізацыях, у выканкомах мясцовых Саветаў народных дэпутатаў, а таксама ў апаратах міністэрстваў, ведамстваў і іншых органаў дзяржаўнай улады і кіравання.

Гаспадарча-прававая. Выпускнікі гэтай спецыялізацыі працуюць у народнай гаспадарцы ў якасці начальнікаў прававых аддзелаў міністэрстваў і ведамстваў, вытворчых аб'яднанняў, прадпрыемстваў, устаноў і арганізацый, а таксама юрысконсультамі.

Судзебна-пракурорска-следчая. Па гэтай спецыялізацыі вядзецца падрыхтоўка суддзяў, пракурораў, следчых, адвакатаў, натарыусаў, работнікаў апарату абласных аддзелаў юстыцыі, органаў унутраных спраў.

У працэсе навучання студэнты праходзяць вытворчую практыку ў народных судах, пракуратуры, следчых органах, юрыдычных аддзелах прадпрыемстваў і арганізацый.

**В. ЧЫГІР,**
**дэкан юрыдычнага факультэта.**

# МЕХАНІКА-МАТЭМАТЫЧНЫ

ЗА АПОШНЯЕ дзесяцігоддзе агульнае развіццё ведаў прывяло да пераканання, што вывучэнне амаль усіх навук патрабуе пэўнага выкарыстання матэматыкі. Матэматыка і яе метады зараз аказаліся неабходнымі для біялогіі і псіхалогіі, сацыялогіі і гісторыі, юрыспрудэнцыі і эстэтыкі, лінгвістыкі і экалогіі, гнасеалогіі і эканомікі. Інтэнсіўны працэс матэматызацыі многіх навук і развіццё вылічальнай тэхнікі аказалі надзвычай вялікі ўплыў і на ўсю матэматыку, расшырыўшы і якасна змяніўшы яе магчымасці.

Сёння інтарэс да матэматыкі абумоўлены не толькі выключным прымяняльнасцю, перспектывай развіцця. Матэматыка прыцягвае сваёй унутранай логікай, харастэвам, строгасцю і прыгажосцю.

Механіка на падставе тэарэтычнага і эксперыментальнага аналізу з'яў даследуе і распрацоўвае асноўныя законы руху цел, вывучае механічныя ўласцівасці розных асяроддзяў, выражае гэтыя законы і ўласцівасці ў выглядзе матэматычных суадносін, стварае тэарэтычныя асновы разлікаў, якія прымяняюцца ў самых разнастайных галінах тэхнікі і навукі. Пры гэтым механіка не толькі выкарыстоўвае, але і развівае матэматыку, узбагачае яе новымі падыходамі, пастаноўкамі і метадамі. Гэтым арганічным узаемадзеяннем матэматыкі і механікі тлумачыцца сумесная падрыхтоўка спецыялістаў па механіцы і матэматыцы на механіка-матэматычным факультэце.

Набор і падрыхтоўка спецыялістаў на факультэце здзяйсняецца на навукова-вытворчым, навукова-педагагічным аддзяленнях і аддзяленні механікі.

На навукова-вытворчым аддзяленні робіцца акцэнт на вывучэнне пастаноўкі і рашэнню розных матэматычных задач. Студэнты навукова-педагагічнага аддзялення вывучаюць дысцыпліны псіхолага-педагагічнага характару. На аддзяленні механікі разам з матэматычнымі дысцыплінамі вывучаюцца гідрамеханіка, тэорыя пругкасці і інш.

З трэцяга курса студэнты факультэта выбіраюць больш вузкую спецыялізацыю на адной з кафедр, слухаюць спецкурсы і ўключаюцца ў работу спецыяльных семінараў. Удзел у рабоце навуковых гурткоў, напісанне курсавых і дыпломных работ стварае ўмовы для развіцця навыкаў навукова-даследчай дзейнасці.

У апошнія гады факультэт заключыў дагаворы аб супрацоўніцтве з многімі навуковымі і вучэбнымі цэнтрамі рэспублікі і краіны, такімі, як АН БССР, з некаторымі аддзеламі АН СССР, двума матэматычнымі факультэтамі МДУ і іншымі.

У здзяйсненні вучэбнага працэсу, акрамя кваліфікаванага прафесарска-выкладчыцкага саставу факультэта, удзельнічаюць буйныя вучоныя і спецыялісты інстытута матэматыкі АН БССР, галіновых навукова-даследчых інстытутаў, вядучых прадпрыемстваў рэспублікі. Усё гэта стварае ўмовы для далейшага павышэння ўзроўню падрыхтоўкі спецыялістаў з улікам сучасных дасягненняў навукі і вытворчасці і спецыфікі будучай работы выпускнікоў.

**М. ГАРАШЧУК,**
**дэкан механіка-матэматычнага факультэта.**

# РАДЫЁФІЗІКІ



ЭЛЕКТРОНІКА, радыётэхніка служаць і будуць служыць чалавеку, рабіць яго жыццё цікавым, змястоўным. І чым больш укараняецца ў наша жыццё электроніка, тым больш патрабуецца для народнай гаспадаркі спецыялістаў гэтага профілю.

Перспектыўнае развіццё ў Беларусі гэтых галін навукі і тэхнікі ставіць перад вышэйшай школай рэспублікі і яе флагманам — Белдзяржуніверсітэтам — сур'ёзныя задачы па забеспячэнню арганізацый і прадпрыемстваў, якія распрацоўваюць або выкарыстоўваюць навейшыя дасягненні радыёфізікі і электронікі, высокакваліфікаванымі кадрамі. Немалая доля адказнасці за паспяховае вырашэнне гэтай задачы кладзецца на самы малады факультэт Белдзяржуніверсітэта — факультэт радыёфізікі і электронікі.

Факультэт рыхтуе высокакваліфікаваных спецыялістаў-радыёфізікаў для работы ў канструктарскіх бюро, лабараторыях і цэхах прадпрыемстваў электроннай і прыладабудаўнічай прамысловасці, у розных навукова-даследчых установах рэспублікі.

Падрыхтоўка радыёфізікаў у БДУ істотна адрозніваецца ад падрыхтоўкі ў тэхнічных ВНУ больш глыбокім вывучэннем розных раздзелаў тэарэтычнай фізікі, вышэйшай матэматыкі, спецыяльных раздзелаў радыёэлектронікі, што забяспечвае студэнтам трывалую базу для наступнай спецыялізацыі, якую яны атрымліваюць на адной з кафедр факультэта.

# ФІЛАЛАГІЧНЫ



ВЫШЭЙШАЯ філалагічная адукацыя ў Беларусі бярэ свой пачатак з часу арганізацыі універсітэта. І мы ганарымся тым, што сярод першых выкладчыкаў беларускай філалогіі быў народны паэт БССР К. М. Міцкевіч (Якуб Колас).

На факультэце вядзецца падрыхтоўка па дзвюх спецыяльнасцях: беларускай і рускай мове і літаратуры; рускай мове і літаратуры. Вучэбную, навуковую і выхаваўчую работу вядуць 7 кафедр, якія аб'ядноўваюць вялікі навукова-педагагічны калектыў. Свае багатыя веды і любоў да родных беларускай і рускай моў і літаратур перадаюць моладзі высокакваліфікаваныя спецыялісты.

На факультэце грунтоўна вывучаюцца грамадскія навукі: гісторыя КПСС, марксісцка-ленінская філасофія, палітычная эканомія, навуковы камунізм, асновы навуковага атэізму, гісторыя філасофіі, марксісцка-ленінская этыка, логіка, марксісцка-ленінская эстэтыка, гісторыя СССР і гісторыя БССР.

Акрамя родных моў і літаратур, усе студэнты вывучаюць таксама замежныя мовы (англійскую, нямецкую, французскую, іспанскую), лацінскую мову і славянскія мовы (польскую, серба-харвацкую, чэшскую, балгарскую). На першым курсе студэнтам чытаецца курс «Уводзіны ў спецыяльнасць».

Сярод дысцыплін, якія вызначаюць філалагічную падрыхтоўку студэнтаў, патрэбна адзначыць мовазнаўчыя і літаратуразнаўчыя.

Да мовазнаўчых дысцыплін адносяцца курсы ўводзін у мовазнаўства і агульнае мовазнаўства, уводзіны ў славянскую філалогію, стараславянская мова, дыялекталогія, асновы культуры мовы. Найбольшая колькасць гадзін адводзіцца на курс сучаснай беларускай (рускай, славянскай) літаратурнай мовы і яе гісторыі як дысцыпліны.

Літаратуразнаўчыя дысцыпліны ўключаюць у сябе ўводзіны ў літаратуразнаўства, тэорыю літаратуры, гісторыю крытыкі, вусную народную творчасць, гісторыю літаратуры, сучасную савецкую літаратуру, гісторыю замежных літаратур і літаратур народаў СССР.

Таго, хто хоча глыбока пазнаць таямніцы роднай мовы і літаратуры, факультэт чакае ў сваіх аўдыторыях.

**А. ВОЛК,**
**дэкан філалагічнага факультэта.**

# ГЕАГРАФІЧНЫ



ГЕАГРАФІЧНЫ ФАКУЛЬТЭТ— вядучы цэнтр падрыхтоўкі студэнтаў па фізічнай, эканамічнай геаграфіі, геамарфалогіі, краязнаўству і метадыцы арганізацыі экскурсійнай справы. У саставе факультэта сем кафедр і дзве навукова-даследчыя лабараторыі: праблемная лабараторыя меліярацыі ландшафтаў і галіновая лабараторыя возеразнаўства, геолага-мінералагічны музей, вучэбная геаграфічная станцыя «Заходняя Беразіна», Браслаўская лімналагічная станцыя.

Студэнты факультэта атрымліваюць вялікую і разнастайную прыродазнаўча-навуковую, грамадскую і спецыяльную падрыхтоўку. Акрамя агульнаадукацыйных прадметаў і грамадскіх дысцыплін, выкладаецца шмат спецкурсаў: вылічальная матэматыка з асновамі праграміравання, матэматычныя метады ў геаграфіі, геалогія і карысныя выкапні СССР, акіяналогія, агульная тапаніміка, асновы ландшафтазнаўства, фізіка- і эканоміка-геаграфічнае раяніраванне, статыстыка, асновы прамысловай і сельскагаспадарчай вытворчасці, фізіка- і эканоміка-геаграфічнае карціраванне, эканамічная геаграфія прыродных рэсурсаў, асновы экскурсазнаўства, рэкрэацыйная геаграфія, асноўныя праблемы фізічнай і эканамічнай геаграфіі, геаграфічныя асновы меліярацыі, геафізіка і геахімія ландшафтаў, краязнаўства і турызм, асновы раённай планіроўкі, народнагаспадарчае планаванне, асновы геаграфічнага прагназіравання, біясфера і прыродавыкарыстанне і інш.

Значнае месца ў падрыхтоўцы спецыялістаў-географаў належыць вучэбна-вытворчым практыкам. Студэнты І і ІІ курсаў на геаграфічнай станцыі «Заходняя Беразіна» праходзяць вучэбную практыку па тапаграфіі, геалогіі, гідралогіі, геамарфалогіі, глебазнаўству, метэаралогіі, біягеаграфіі, ландшафтазнаўству і эканамічнай геаграфіі. Штогод комплексная геаграфічная практыка студэнтаў ІІІ курса праводзіцца за межамі рэспублікі (у Карпатах, на Каўказе і Урале, у Карэліі і Сярэдняй Азіі). Для больш глыбокага вывучэння прыроды, насельніцтва і гаспадаркі замежных краін студэнты накіроўваюцца ў Балгарыю, Югаславію і Польшчу. Старшакурснікі праходзяць вытворчую практыку ў навукова-даследчых, праектных, планавых і гаспадарчых арганізацыях, уключаюцца ў састаў экспедыцый, якія праводзяць работу ў Беларусі і за яе межамі (Забайкалле, Далёкі Усход, Сярэдняя Азія, Каўказ і інш.). Студэнты факультэта прымаюць актыўны ўдзел у навукова-даследчай рабоце. Пры ўсіх кафедрах працуюць навукова-даследчыя гурткі.

Факультэт рыхтуе кадры спецыялістаў-географаў для навукова-даследчай і вучэбна-метадычнай работы. Выпускнікі факультэта працуюць у агульнаадукацыйных школах, сярэдніх і вышэйшых навучальных установах, інстытутах АН БССР, праектных і планавых арганізацыях, на картаграфічных прадпрыемствах, у гідраметэаслужбе, абласных і гарадскіх экскурсійных бюро, на турбазах.

**М. РАМАНОЎСКІ,**
**дэкан геаграфічнага факультэта.**

# БІЯЛАГІЧНЫ

БІЯЛАГІЧНЫ ФАКУЛЬТЭТ рыхтуе кваліфікаваных біяхімікаў, гідрабіёлагаў, генетыкаў і цытолагаў, мікрабіёлагаў, фізіёлагаў раслін, фізіёлагаў чалавека і жывёл, заолагаў і батанікаў, спецыялістаў па ахове прыроды.

У мінулым годзе біялагічны факультэт перайшоў у новы высотны, прасторны светлы будынак, дзе ёсць першакласныя аўдыторыі і лабараторыі, якія абсталяваны сучаснай апаратурай.

Вучэбную практыку студэнтыбіёлагі праходзяць у вучэбных лабараторыях кафедр, у навукова-даследчых лабараторыях факультэта, у батанічным садзе універсітэта, у заалагічным музеі, аранжарэі, вучэбна-даследчай гаспадарцы «Шчамысліца» і на біястанцыі «Нарач».

Пасля агульнабіялагічнай, фізіка-матэматычнай і хімічнай падрыхтоўкі студэнты з ІІІ курса прыступаюць да спецыялізацыі ў выбранай імі галіне біялогіі: на кафедрах яны слухаюць спецыяльныя лекцыйныя курсы, праходзяць спецпрактыкум, выконваюць курсавыя і дыпломныя работы. Студэнты шырока прыцягваюцца да навуковых даследаванняў па заданнях кафедр. Пры кафедрах і лабараторыях працуюць дзевяць студэнцкіх навуковадаследчых гурткоў. Члены студэнцкага навуковага таварыства актыўна ўдзельнічаюць у рэспубліканскіх і ўсесаюзных конкурсах. І, як правіла, работы іх заслугоўваюць высокай ацэнкі. Многія з іх публікуюцца ў навуковых зборніках.

Выпускнікі накіроўваюцца на работу ў якасці настаўнікаў сярэдніх школ, выкладчыкаў сярэдніх спецыяльных навучальных устаноў і інстытутаў, ва ўстановы сістэмы Дзяржаўнага камітэта па ахове прыроды, дзяржаўныя запаведнікі, паляўнічыя гаспадаркі, на прамысловыя прадпрыемствы, а студэнты, якія праявілі схільнасць да навукова-даследчай работы — у лабараторыі і аспірантуру універсітэта, у інстытуты Акадэміі навук БССР, а таксама ў навукова-даследчыя інстытуты Міністэрства сельскай гаспадаркі, Міністэрства аховы здароўя.



Спецыялістам, якія скончылі біялагічны факультэт, прысвойваецца кваліфікацыя біёлаг, выкладчык біялогіі і хіміі.

**А. ШУКАНАЎ,**
**дэкан біялагічнага факультэта.**

# ФІЗІЧНЫ

ПРЫМЯНЕННЕ фізічных метадаў даследавання абумовіла нябачны росквіт сучаснай біялогіі і медыцыны, электронікі, хіміі і г. д. Зараз няма ніводнай галіны навукі і народнай гаспадаркі, якія б не мелі патрэбы ў спецыялістах-фізіках высокай кваліфікацыі. Такіх спецыялістаў рыхтуюць на фізічным факультэце. У яго саставу ўваходзяць 10 кафедр, якія здзяйсняюць падрыхтоўку фізікаў са спецыялізацыямі ў самых рознабаковых галінах сучаснай фізічнай навукі: тэарэтычнай фізіцы, фізіцы ядра і элементарных часціц, фізіцы ядзерных энергетычных установак, фізіцы цвёрдага цела, біяфізіцы, фізіцы паўправаднікоў, оптыцы і спектраскапіі, цеплафізіцы, оптыкаэлектраніцы, мікраэлектроніцы, радыяцыйным матэрыялазнаўстве.

Высокі тэарэтычны ўзровень агульнанавуковай і агульнапрафесіянальнай падрыхтоўкі, якая базіруецца на фундаментальнай матэматычнай аснове ў спалучэнні са спецыялізацыяй у адной з галін фізікі, дазваляе выпускнікам навукова-вытворчага патоку факультэта адразу ж пасля заканчэння універсітэта ўключыцца ў самастойную вытворчую або навукова-даследчую работу на прадпрыемствах рэспублікі ці ў навукова-даследчых інстытутах, а выпускнікам навуковапедагагічнага патоку — стаць выкладчыкамі ВНУ, тэхнікумаў, прафесійна-тэхнічных вучылішчаў, сярэдніх школ.

Сярод выпускнікоў фізічнага факультэта 4 Героі Сацыялістычнай Працы, 2 акадэмікі АН СССР, 15 акадэмікаў і членаў-карэспандэнтаў АН БССР, 6 лаўрэатаў Ленінскай прэміі, звыш 30 лаўрэатаў Дзяржаўных прэмій СССР, БССР і прэміі Ленінскага камсамола. Выпускнікамі фізічнага факультэта зроблена 4 адкрыцці ў галіне фізікі.

Фізіка — навука пярэдняга краю, навука-разведчык, межы яе ляжаць у галіне фантастыкі, а часам і подзвігу. Яна настолькі цікавая, наколькі і цяжкая.

**Э. ШПІЛЕЎСКІ,**
**дэкан фізічнага факультэта.**

# І ЭЛЕКТРОНІКІ

Кафедра радыётэхнікі і фізічнай электронікі рыхтуе спецыялістаў па фізічнай электроніцы і мікраэлектроніцы. Студэнты вывучаюць фізічныя працэсы, на аснове якіх працуюць сучасныя электронныя прылады, асвойваюць методыку распрацоўкі і тэхналогію вырабу мікрасхем.

Кафедра электронных матэматычных машын рыхтуе спецыялістаў, якія не толькі дасканала валодаюць ЭВМ, але здольны прымаць і непасрэдны ўдзел у іх удасканаленні, у распрацоўцы новых мадэлей.

Кафедра электрафізікі здзяйсняе спецыялізацыю па інфрачырвонай тэхніцы і па аднаму з перспектыўных напрамкаў сучаснай радыёфізікі — квантавай радыёфізікі.

Кафедра радыёфізікі і электронікі ЗВЧ забяспечвае падрыхтоўку спецыялістаў у галіне прыёму і апрацоўкі інфармацыі.

Самая маладая кафедра на факультэце, створаная ў 1981-82 навучальным годзе, — кафедра кібернетыкі спецыялізуе студэнтаў у галіне аўтаматызацыі навуковых даследаванняў.

Студэнты факультэта маюць магчымасць актыўна ўдзельнічаць у вырашэнні навуковых даследаванняў, якія праводзяцца на кафедрах.

Выпускнікі факультэта паспяхова працуюць на прадпрыемствах і ў арганізацыях, якія распрацоўваюць сучасную электронную апаратуру. Многія з выхаванцаў факультэта сталі вядомымі кіраўнікамі вытворчых калектываў.

**А. ШЫРОКАЎ,**
**дэкан факультэта радыёфізікі і электронікі.**

# ПРЫКЛАДНОЙ МАТЭМАТЫКІ

ФАКУЛЬТЭТ прыкладной матэматыкі быў створаны ў 1970 годзе з мэтай прафесіянальнай падрыхтоўкі ў Беларусі матэматыкаў-прыкладнікоў, спецыялістаў у галіне прымянення матэматычных метадаў вырашэння і даследавання самых розных задач, якія ўзнікаюць у навуцы, тэхніцы і іншых галінах народнай гаспадаркі, з шырокім выкарыстаннем сучасных хуткадзеючых электронных вылічальных машын. Гэта спецыялісты, якія валодаюць глыбокімі ведамі па агульнатэарэтычных і спецыяльных матэматычных дысцыплінах, добра знаёмы з магчымасцямі ЭВМ і здольны разам з прадстаўнікамі іншых спецыяльнасцей весці навукова-даследчую работу па складанню матэматычных мадэляў розных працэсаў, распрацоўцы алгарытмаў іх лічбавага рашэння на ЭВМ, а таксама па стварэнню матэматычнага забеспячэння аўтаматызаваных сістэм кіравання ЭВМ і праектаванню саміх АСК і іх комплексаў.



На працягу першых двух год студэнты факультэта прыкладной матэматыкі атрымліваюць глыбокую агульнанавуковую падрыхтоўку, якая ўключае асноўныя матэматычныя дысцыпліны, а таксама асновы эксплуатацыі ЭВМ. Спецыяльнасць прыкладная матэматыка ўключае тры спецыялізацыі: прымяненне сродкаў вылічальнай тэхнікі, матэматычнае забеспячэнне ЭВМ і матэматычнае забеспячэнне АСК. Вытворчую і перадыпломную практыку студэнты праходзяць на прадпрыемствах і ў навукова-даследчых арганізацыях па месцу сваёй будучай работы.

Навучанне заканчваецца абаронай дыпломнага праекта і здачай дзяржаўнага экзамена па навуковаму камунізму. Выпускнікам факультэта прысвойваецца кваліфікацыя матэматыка. Яны накіроўваюцца на работу ў навукова-даследчыя інстытуты, КБ прадпрыемстваў электроннай і радыёпрамысловасці, вылічальныя цэнтры, а таксама ў іншыя арганізацыі, якія выкарыстоўваюць ЭВМ. Лепшыя студэнты працягваюць вучобу ў аспірантуры.

Уся вучэбная і навукова-даследчая работа са студэнтамі вядзецца выкладчыкамі васьмі кафедр, супрацоўнікамі дзвюх галіновых лабараторый і вылічальнага цэнтра, а таксама вядомымі спецыялістамі з прадпрыемстваў і ўстаноў, з якімі факультэт падтрымлівае навукова-тэхнічнае супрацоўніцтва.

У 1982 годзе на факультэце адкрываецца вячэрняе аддзяленне. Тым самым выпускнікі радыётэхнікума і політэхнікума і іншыя абітурыенты, якія спецыялізаваліся на прыкладной матэматыцы ці маюць дачыненне да ЭВМ, будуць мець магчымасць павышаць кваліфікацыю без адрыву ад вытворчасці.

Вялікая ўвага аддаецца самастойнай навукова-даследчай рабоце студэнтаў. На факультэце працуюць студэнцкія навукова-даследчыя лабараторыі, у якіх студэнты, выкарыстоўваючы тэарэтычныя веды, распрацоўваюць пакеты прыкладных праграм для вырашэння розных задач народнай гаспадаркі і ўкараняюць перспектыўнае матэматычнае забеспячэнне АСК і ЭВМ.

**В. КОРЗЮК,**
**дэкан факультэта прыкладной матэматыкі.**

# З Правілаў прыёму ў БДУ імя У. І. Леніна ў 1982 годзе

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.).

### III. УСТУПНЫЯ ЭКЗАМЕНЫ

Паступаючыя ва універсітэт здаюць экзамены ў залежнасці ад выбранай спецыяльнасці па дысцыплінах:

на спецыяльнасць **беларуская і руская мова і літаратура** — па рускай мове і літаратуры (пісьмова), беларускай мове і літаратуры (пісьмова і вусна), гісторыі СССР (вусна);

на спецыяльнасці **руская мова і літаратура, журналістыка, гісторыя, філасофія, правазнаўства** — па рускай мове і літаратуры (пісьмова і вусна), гісторыі СССР (вусна), замежнай мове (вусна);

на спецыяльнасці **фізіка, матэматыка, механіка, прыкладная матэматыка, радыёфізіка і электроніка** — па матэматыцы (пісьмова і вусна), фізіцы, (вусна), рускай мове і літаратуры (пісьмова);

на спецыяльнасць **хімія** — па хіміі (вусна), матэматыцы (вусна), фізіцы (вусна), рускай мове і літаратуры (пісьмова);

на спецыяльнасць **біялогія** — па біялогіі (вусна), хіміі (вусна), матэматыцы (вусна), рускай мове і літаратуры (пісьмова);

на спецыяльнасці **геаграфія і палітычная эканомія** — па матэматыцы (вусна), геаграфіі (вусна), гісторыі СССР (вусна), рускай мове і літаратуры (пісьмова).

Паступаючыя ва універсітэт на спецыяльнасці журналістыка, гісторыя, філасофія, правазнаўства, фізіка, матэматыка, механіка, прыкладная матэматыка, радыёфізіка і электроніка, хімія, біялогія, геаграфія, палітычная эканомія замест экзамена па рускай мове і літаратуры могуць (па жаданню) здаваць экзамен па беларускай мове і літаратуры.

**Заўвага:** узнагароджаныя пасля заканчэння сярэдняй школы залатым (сярэбраным) медалём ці скончыўшыя сярэднюю спецыяльную ці прафесійна-тэхнічную навучальную ўстанову з дыпломам з адзнакай здаюць экзамены толькі па адной з дысцыплін, а іменна: паступаючыя на спецыяльнасць беларуская і руская мова і літаратура—па беларускай мове і літаратуры (вусна), на спецыяльнасць руская мова і літаратура — па рускай мове і літаратуры (вусна); на спецыяльнасць журналістыка пасля праходжання творчага конкурсу — па рускай мове і літаратуры ці (па жаданню паступаючага) па беларускай мове і літаратуры (вусна); на спецыяльнасці матэматыка, механіка, прыкладная матэматыка, палітычная эканомія — па матэматыцы (вусна); на спецыяльнасці фізіка, радыёфізіка і электроніка — па фізіцы (вусна); на спецыяльнасць хімія — па хіміі (вусна); на спецыяльнасць біялогія — па біялогіі (вусна); на спецыяльнасць геаграфія — па геаграфіі (вусна); на спецыяльнасці гісторыя, філасофія, правазнаўства — па гісторыі СССР (вусна).

Пры здачы экзамена з адзнакай «пяць» яны вызваляюцца ад далейшай здачы ўступных экзаменаў, а пры атрыманні адзнакі «чатыры» або «тры» здаюць экзамены па ўсіх адпаведных дысцыплінах.

Пісьмовы ўступны экзамен па рускай мове і літаратуры праводзіцца ў выглядзе сачынення.

Тым, хто дапушчаны да ўступных экзаменаў, прадастаўляецца ва ўстаноўленым парадку дадатковы водпуск 15 каляндарных дзён (не ўлічваючы часу на праезд у ВНУ і назад) па месцу работы без захавання заработнай платы.

Тыя, хто не з'явіўся без уважлівых прычын на адзін з экзаменаў у назначаны па раскладу час ці атрымаў нездавальняючую адзнаку па аднаму з экзаменаў, да далейшых экзаменаў не допускаюцца. **Пераздача экзамена з мэтай павышэння ацэнкі не дазваляецца.**

### IV. ПАРАДАК ЗАЛІЧЭННЯ

Без уступных экзаменаў па меры падачы заяў ва універсітэт залічваюцца звольненыя ў запас па скарачэнню штатаў па стану здароўя і выслузе з Узброеных Сіл СССР, органаў Камітэта дзяржаўнай бяспекі СССР і органаў Міністэрства ўнутраных спраў СССР афіцэры, прапаршчыкі, мічманы і іншыя ваеннаслужачыя звыштэрміновай службы, якія маюць закончаную вышэйшую ваенную адукацыю, а таксама незакончаную ваенную ці грамадзянскую адукацыю, незалежна ад часу звальнення ў запас і ад курса, на якім яны навучаліся, на першы курс ці на наступныя курсы.

**Па-за конкурсам** пры атрыманні станоўчых адзнак на ўступных экзаменах залічваюцца:

а) звольненыя ў запас з Узброеных Сіл СССР, органаў Камітэта дзяржаўнай бяспекі СССР і органаў Міністэрства ўнутраных спраў СССР афіцэры, прапаршчыкі, мічманы і іншыя ваеннаслужачыя звыштэрміновай службы, якія маюць закончаную сярэднюю адукацыю, незалежна ад часу звальнення ў запас;

б) ваеннаслужачыя, звольненыя з тэрміновай ваеннай службы і накіраваныя на навучанне на спецыяльнасці філасофія, радыёфізіка і электроніка па рэкамендацыях воінскіх часцей (дадатак № 8 да Правілаў прыёму);

в) аўтары выкарыстаных у вытворчасці вынаходніцтваў, а таксама асобы, якім прысвоена званне заслужанага рацыяналізатара рэспублікі;

г) выпускнікі тэхнічных вучылішчаў, якія атрымалі дыплом з адзнакай і паступаюць у ВНУ на навучанне без адрыву ад вытворчасці па блізкіх спецыяльнасцях.

**Па конкурсу** залічваюцца паспяхова здаўшыя ўступныя экзамены на месцы, якія засталіся пасля залічэння асоб, маючых права на паступленне ў ВНУ без уступных экзаменаў і па-за конкурсам.

Конкурсны адбор паступаючых праводзіцца ў адпаведнасці з агульнай колькасцю балаў на аснове адзнак, якія атрыманы на ўступных экзаменах, і сярэдняй арыфметычнай адзнакі па ўсіх дысцыплінах з дакумента аб сярэдняй адукацыі, пры гэтым залічэнне на аснове конкурснага адбору праводзіцца ў наступным парадку:

**На навучанне з адрывам ад вытворчасці** залічэнне праводзіцца ў межах агульнай колькасці месц, размеркаваных рэктарам прапарцыянальна колькасці пададзеных заяў паміж паступаючымі наступных дзвюх катэгорый:

1. Асобамі, якія маюць стаж практычнай работы не менш двух гадоў, а таксама звольненымі ў запас ваеннаслужачымі, якія праслужылі на ваеннай службе не менш двух гадоў.

2. Асобамі, якія паступаюць ва універсітэт у год заканчэння навучальнай установы (якія не маюць двухгадовага стажу практычнай работы).

З ліку паспяхова здаўшых уступныя экзамены ў першую чаргу па конкурсу залічваюцца:

— перадавікі вытворчасці, накіраваныя ў ВНУ на навучанне з адрывам ад вытворчасці ў адпаведнасці з пастановай Савета Міністраў СССР ад 18 верасня 1959 года № 1099, па прадстаўленні накіравання па адзінай форме (дадатак № 12 да Правілаў прыёму);

— пастаянна пражываючыя ў сельскай мясцовасці і маючыя стаж практычнай работы па выбранай ці блізкай спецыяльнасці пры паступленні на спецыяльнасць біялогія;

— пастаянна пражываючыя ў сельскай мясцовасці пры паступленні на спецыяльнасці: беларуская і руская мова і літаратура, біялогія, геаграфія, гісторыя, матэматыка (толькі педагагічны паток), руская мова і літаратура, фізіка (толькі педагагічны паток), хімія (толькі педагагічны паток).

На навучанне без адрыву ад вытворчасці ў першую чаргу залічваюцца асобы, характар работы якіх адпавядае выбранай (ці блізкай) у вышэйшай навучальнай установе спецыяльнасці, калі яны працуюць па гэтай спецыяльнасці не менш шасці месяцаў, выпускнікі сярэдніх спецыяльных і сярэдніх прафесійна-тэхнічных навучальных устаноў, паступаючыя на блізкія спецыяльнасці, а таксама звольненыя ў запас ваеннаслужачыя. Пры гэтым правам пераважнага залічэння карыстаюцца асобы, накіраваныя прадпрыемствамі, калгасамі, саўгасамі, установамі і арганізацыямі на навучанне па спецыяльнасці, адпавядаючай характару работы паступаючага па прадстаўленні накіравання па адзінай форме (дадатак № 9 да Правілаў прыёму).

На месцы, якія засталіся, прымаюцца паступаючыя, характар работы якіх не адпавядае выбранай у ВНУ спецыяльнасці ці якія маюць стаж работы па выбранай у ВНУ ці блізкай спецыяльнасці менш шасці месяцаў.

Пры роўнасці агульнай колькасці балаў пераважным правам на залічэнне карыстаюцца:

— ваеннаслужачыя, звольненыя з тэрміновай ваеннай службы;

— маючыя большы стаж практычнай работы па выбранай у ВНУ ці блізкай ёй спецыяльнасці;

— узнагароджаныя пасля заканчэння сярэдняй школы залатым (сярэбраным) медалём, скончыўшыя сярэднюю спецыяльную ці прафесійна-тэхнічную навучальную ўстанову з дыпломам з адзнакай;

— узнагароджаныя пасля заканчэння сярэдняй школы пахвальнымі граматамі за поспехі па адной ці некалькіх дысцыплінах уступных экзаменаў;

— праявіўшыя здольнасці ў галіне ведаў, адпаведнай выбранай у ВНУ спецыяльнасці, а таксама актыўна ўдзельнічаючыя ў школьных і іншых гуртках, у алімпіядах, конкурсах і аглядах, якія праводзяцца вышэйшымі навучальнымі ўстановамі і арганізацыямі.

Усе пытанні, звязаныя з прыёмам ва універсітэт, канчаткова вырашаюцца прыёмнай камісіяй.

Паступаючыя ва універсітэт накіроўваюць дакументы па адрасу: **220080, г. Мінск, Ленінскі праспект, 4, Белдзяржуніверсітэт імя У. І. Леніна, Прыёмнай камісіі.**

Прыёмная камісія знаходзіцца ў **фізічным корпусе універсітэта, тэл. 20-94-15.**

**ПРЫЁМНАЯ КАМІСІЯ.**

# ЗАВОЧНЫ ФАКУЛЬТЭТ

ПАДРЫХТОЎКА студэнтаў на завочным факультэце вядзецца па васьмі спецыяльнасцях —беларускай і рускай мове і літаратуры, біялогіі, геаграфіі, журналістыцы, гісторыі, правазнаўству, рускай мове і літаратуры, філасофіі.

Студэнтам-завочнікам, якія паспяхова навучаюцца, на перыяд экзаменацыйна-лабараторных сесій прадастаўляецца па месцы работы дадатковы водпуск з захаваннем заработнай платы на 30 каляндарных дзён на І, ІІ курсах і 40 каляндарных дзён на ўсіх наступных курсах.

Праезд студэнтаў завочнага факультэта ў навучальную ўстанову для выканання і здачы залікаў і экзаменаў адзін раз у год, а таксама для падрыхтоўкі і абароны дыпломнай работы ці здачы дзяржаўных экзаменаў аплачваецца ў размеры 50 працэнтаў кошту праезду за кошт прадпрыемстваў і ўстаноў па месцы работы студэнтаў.

На перыяд 10 вучэбных месяцаў перад пачаткам выканання дыпломнай работы ці здачы дзяржаўнага экзамена студэнт-завочнік мае права на атрыманне аднаго вольнага ад работы дня з аплатай у размеры 50 працэнтаў заработнай платы, але не ніжэй мінімальнай. Акрамя таго, кіраўнікам прадпрыемстваў і ўстаноў дазваляецца прадастаўляць па жаданню студэнтаў яшчэ адзін-два вольныя дні ў тыдзень без захавання заработнай платы.

Сёння на завочным факультэце універсітэта навучаецца больш 3,5 тысяч студэнтаў.

**Л. ІСАЧАНКАВА,**
**дэкан завочнага факультэта.**

# УВЕЧАРЫ—У АЎДЫТОРЫЮ

НА ФАКУЛЬТЭТАХ прыкладной матэматыкі, механіка-матэматычным, фізічным, радыёфізікі і электронікі, геаграфічным, хімічным, юрыдычным, філалагічным і гістарычным ёсць вячэрнія аддзяленні. Прыём на І курс вячэрніх аддзяленняў у гэтым навучальным годзе будзе праводзіцца па наступных спецыяльнасцях: прыкладная матэматыка, матэматыка, фізіка, радыёфізіка і электроніка, геаграфія, хімія, правазнаўства, руская мова і літаратура, гісторыя.

У конкурсе пры паступленні на вячэрнія аддзяленні ўдзельнічаюць асобы, якія могуць па свайму месцу жыхарства наведваць усе віды вучэбных заняткаў.

Студэнтам-вячэрнікам, якія паспяхова выконваюць вучэбны план, у адпаведнасці з пастановай Савета Міністраў СССР ад 2 ліпеня 1959 года прадугледжваюцца дадатковыя водпускі з захаваннем заработнай платы на перыяд здачы экзаменаў і залікаў. Працягласць водпуску на І і ІІ курсах — 20 каляндарных дзён, на ІІІ і наступных курсах — 30 каляндарных дзён.

На перыяд падрыхтоўкі і абароны дыпломнай работы водпуск складае 4 месяцы. Акрамя таго, на перыяд 10 вучэбных месяцаў перад пачаткам выканання дыпломнага праекта студэнты-вячэрнікі маюць права на атрыманне аднаго свабоднага дня ў тыдзень з аплатай яго ў размеры 50 працэнтаў заработнай платы.

Тэрмін навучання на вячэрніх аддзяленнях — 6 гадоў.

**У. БАГДАНАЎ,**
**прарэктар па вячэрняму і завочнаму навучанню.**

# ПАДРЫХТОЎЧАЕ АДДЗЯЛЕННЕ

НА ПАДРЫХТОЎЧЫМ аддзяленні універсітэта на дзённай форме навучанне вядзецца па спецыяльнасцях беларуская і руская мова і літаратура, журналістыка, руская мова і літаратура, гісторыя, філасофія, палітычная эканомія, правазнаўства, матэматыка, прыкладная матэматыка, фізіка, радыёфізіка і электроніка, біялогія, хімія, геаграфія.

На вячэрняй форме — па спецыяльнасцях гісторыя, філасофія, правазнаўства, фізіка, радыёфізіка і электроніка, матэматыка.

На падрыхтоўчае аддзяленне прымаюцца грамадзяне, якія маюць сярэднюю адукацыю і бесперапынны стаж работы не менш года, з ліку перадавых рабочых, калгаснікаў, а таксама звольненых у запас з Савецкай Арміі, па накіраваннях прамысловых прадпрыемстваў, будоўляў, арганізацый транспарту і сувязі, геолагаразведачных арганізацый, саўгасаў, калгасаў, спажывецкіх кааперацый, камандавання воінскіх падраздзяленняў.

Паступаючыя на падрыхтоўчае аддзяленне прадстаўляюць заяву, накіраванне, дакумент аб сярэдняй адукацыі (арыгінал), характарыстыку, падпісаную кіраўніком прадпрыемства, старшынёй мясцкома, сакратаром камітэта камсамола, а для членаў КПСС — сакратаром партыйнай арганізацыі, копію працоўнай кніжкі, падпісаную кіраўніком прадпрыемства і завераную гербавай пячаткай, шэсць фотакартак (3×4 см), медыцынскую даведку (форма 286).

Слухачам дзённай формы навучання выплачваецца стыпендыя 40 рублёў, а паступіўшым па накіраваннях (форма № 2) — на 15 працэнтаў вышэй.

**Дакументы на дзённае навучанне прымаюцца з 1 кастрычніка па 10 лістапада. Субяседаванне—з 11 па 20 лістапада. Заняткі з 1 снежня. Ад звольненых у запас пасля 10 лістапада дакументы прымаюцца да 15 студзеня.**

**Дакументы на вячэрняе навучанне прымаюцца з 1 жніўня па 10 верасня. Субяседаванне — з 11 па 25 верасня. Заняткі з 1 кастрычніка.**

Слухачы падрыхтоўчага аддзялення дзённага навучання пры паспяховай здачы выпускных экзаменаў залічваюцца на І курс стацыянара, слухачы вячэрняга навучання — на дзённую, вячэрнюю і завочную форму навучання.

**А. СЛУКА,**
**загадчык падрыхтоўчага аддзялення.**

**БЕЛАРУСКІ УНІВЕРСІТЭТ**

**Ордэна Працоўнага Чырвонага Сцяга друкарня выдавецтва ЦК КПБ.**

**22 красавіка 1982 г.**

АТ 21236 Заказ 830.

**220080 МІНСК-80, УНІВЕРСІТЭЦКІ ГАРАДОК, ГЕАГРАФІЧНЫ КОРПУС, п. 14.**

**ТЭЛЕФОН 20-68-27.**

**Рэдактар**

**В. П. ВАРАБ'ЁЎ**